УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ ГРАМАДСКІХ ДЗЕЯЧАЎ, ДЗЕЯЧАЎ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ

**1994–2007**

**ФОНД № 377**

**ВОПІС № 1**

**1918–2007, коп. за 1863–1973 гг.**

МІНСК 2024

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 377**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ В.А. ЛАЗОЎСКАГА | 1-52 | 1-6 |
| 1.1. | ДЗЁННІКІ В.А. ЛАЗОЎСКАГА | 1-26 | 1-3 |
| 1.2. | ІНТЭРВ'Ю В.А. ЛАЗОЎСКАГА І ІНШ. | 27-52 | 3-6 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ Н.А. ЛУР'Е | 53-55 | 6 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ М.М. НІКОЛЬСКАГА | 56-57 | 6 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ М.Ф. ПЛАВІНСКАГА | 58-63 | 6-7 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ Ф.Ф. ТУРУКА | 64-67 | 7 |
| 6. | ДАКУМЕНТЫ Б.-К. ХОМІЧ | 68-76 | 7-9 |
| 6.1. | ДАКУМЕНТЫ Б.-К. ХОМІЧ | 68-73 | 7-8 |
| 6.2. | ДАКУМЕНТЫ СЯМ'І Б. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА | 74-76 | 8-9 |
| 7. | ДАКУМЕНТЫ М.А. ШАБУНІ-ЧАПЯЛЁВАЙ | 77-83 | 9-10 |
| 7.1. | ДАКУМЕНТЫ М.А. ШАБУНІ-ЧАПЯЛЁВАЙ | 77-79 | 9 |
| 7.2. | ДАКУМЕНТЫ С. ЛУЦКЕВІЧА, Э. ШАБУНІ І ІНШ. | 80-83 | 9-10 |

## Прадмова

У выніку навукова-тэхнічнага апісання складзены вопіс № 1 у колькасці 83 спраў (176 дакументаў) за 1918–2007, коп. за 1863-1973 гады, якія паступілі ў БДАМЛМ у 1994–2007 гадах. Вопіс складаецца з 7 раздзелаў, сістэматызаваных па алфавіце прозвішчаў фондаўтваральнікаў, унутры раздзелаў – адпаведна прынятай у БДАМЛМ схемы.

Першы раздзел прадстаўлены дакументамі **Вячаслава Антонавіча Лазоўскага** – філолага, выкладчыка рускай мовы і літаратуры. В.А. Лазоўскі нарадзіўся 4 студзеня 1941 года ў гарадскім пасёлку Мір Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці. У 1958 годзе скончыў Ярэміцкую сярэднюю школу, у 1962–1967 гадах вучыўся на філалагічным факультэце БДУ імя У.І. Леніна. Пасля сканчэння ВНУ працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў Вяляціцкай сярэдняй школе Барысаўскага раёна, у 1970–1971 гадах – у Лапшыхскай школе Айчынскага раёна Краснадарскай края, пасля – у школах Салігорска, Пухавіцкага і Мінскага раёнаў, з 1979 года – у Мінскім кааператыўным тэхнікуме Белкаапсаюза (цяпер – Мінскі філіял Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі), з 1993 года – у Рэспубліканскім вучылішчы алімпійскага рэзерва. Са снежня 2000 года – на пенсіі па стане здароўя.

Дакументы В.А. Лазоўскага былі перададзены ў БДАМЛМ ад яго самога (па рэкамендацыі Янкі Брыля) у 2000 годзе. Яны прадстаўлены двума падраздзеламі – дзённікамі і інтэрв’ю В.А. Лазоўскага (запісамі праведзеных ім інтэрв’ю з прадстаўнікамі розных сацыяльных і ўзроставых груп і інш). Справы ў радзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1993–2000 гг.

Другі раздзел складаюць дакументы **Нінэль Абрамаўны Лур’е** – заслужанай настаўніцы БССР, дочкі эканаміста, прафесара А.І. Лур’е. Н.А. Лур’е нарадзілася 21 чэрвеня 1925 года ў Мінску. У 1941–1944 гадах знаходзілася з бацькамі ў эвакуацыі ў Чувашыі. У 1948 годзе скончыла БДУ, працавала настаўніцай у СШ № 2, потым – СШ № 4 Мінска. У 1974 годзе была ўзнагароджана значком “Выдатнік народнай адукацыі”. Н.А. Лур’е памерла 5 верасня 1995 года ў Мінску.

Дакументы Н.А. Лур’е былі перададзены ей самой у 1997 годзе. Гэта ўспаміны і фатаграфіі Н.А. Лур’е, індывідуальныя і ў групах з аднакласнікамі і інш., фатаграфіі А.І. Лур’е (бацькі) і інш. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1994–1995, коп. за 1923–1973 гг.

Трэці раздзел прадстаўлены дакументамі **Мікалая Міхайлавіча Нікольскага** – гісторыка-арыенталіста, акадэміка. М.М. Нікольскі нарадзіўся 1 (13) лістапада 1877 года ў Маскве ў сям’і гісторыка-арыенталіста М.В. Нікольскага. У 1896 годзе з залатым медалём скончыў гімназію, паступіў на філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта (цяпер – Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.В. Ламаносава). Па сканчэнні ВНУ атрымаў месца выкладчыка ў Маскоўскай жаночай гімназіі імя В.Ф. Пратапопавай. Пасля рэвалюцыі 1917 года працаваў настаўнікам у савецкай працоўнай

школе, выкладчыкам Сацыялістычнай акадэміі грамадскіх навук у Маскве. У 1918 годзе пераехаў у Смаленск, дзе працаваў выкладчыкам, з восені 1919 года – рэктарам Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта (цяпер існуе пад той жа назвай). У 1921 годзе па запрашэнні рэктара У.І. Пічэты пераехаў у Мінск для працы ў БДУ, з 1924 года стаў дэканам педагагічнага факультэта, з 1934 года – загадчык кафедры гісторыі Старажытнага свету і Сярэдніх вякоў (пасля яе падзелу з 1938 года – гісторыі Старажытнага свету). У 1931 годзе абраны акадэмікам АН БССР. У 1934 годзе стаў доктарам гістарычных навук, у 1938 – заслужаным дзеячам навукі БССР. У 1937–1953 гадах узначальваў Інстытут гісторыі Акадэвіі навук БССР. М.М. Нікольскі памёр 19 лістапада 1959 г. у Мінску.

Дакументы М.М. Нікольскага былі перададзены ў БДАМЛМ у 1997 годзе. Гэта машынапіс яго кнігі "Происхождение и история белорусской свадебной обрядности" (1947–1948) і суправаджальнае пісьмо да яго (1948).

Чацвёрты раздзел складаюць дакументы **Мікалая Фёдаравіча Плавінскага** (нарадзіўся ў 1927 г.) – краязнаўцы, аматара М. Забэйды-Суміцкага, перададзеныя ім самім у 1997 годзе. Гэта артыкулы М.Ф. Плавінскага, яго перапіска з М. Забэйдай-Суміцкім і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1964–1991 гг.

У пятым раздзеле змешчаны дакументы прафесара **Фёдара Фёдаравіча Турука** – гісторыка, грамадскага дзеяча. Ф.Ф. Турук нарадзіўся 8 лютага 1889 года ў вёсцы Балотца Навагрудскага павета Мінскай губерні (цяпер – Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці). У 1915 годзе скончыў Петраградскі гісторыка-філалагічны інстытут і Петраградскі археалагічны інстытут (цяпер – Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт), пасля чаго працаваў выкладчыкам гімназій у Мінску і Маскве. З сакавіка 1918 года з'яўляўся загадчыкам аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята (РСФСР), быў адным з арганізатараў Беларускага народнага ўніверсітэта і Беларускага навуковага таварыства ў Маскве. Удзельнічаў у стварэнні БДУ, з 1921 года – прафесар установы. З 1923 года выкладаў у Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцяў Захаду імя Ю. Мархлеўскага ў Маскве і іншых ВНУ. Аўтар прац па гісторыі Беларусі. Ф.Ф. Турук памёр 20 ліпеня 1960 года ў Маскве.

Дакументы Ф.Ф. Турука ў 1994 годзе былі вылучаны з асабістага архіва Я.Ю. Раманоўскай. Гэта тэкст лекцыі Ф.Ф. Турука, яго выпіскі з друкаваных выданняў [1920-х гг.], дароўны надпіс Я.І. Хлябцэвіча Ф.Ф. Туруку і інш. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за [1918] – 1985 гг.

Шосты раздзел складаюць дакументы **Бэаты-Крыстыны Хоміч** (дзявочае Марцінкевіч) – праўнучкі стрыечнага брата Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча[1]. Б.-К. Хоміч нарадзілася 3 лютага 1924 года ў Валожыне, вучылася ў гімназіях Валожына, Пінска, Гродна. У 1945 года, ратуючыся ад

[1] Апроч таго, родная цётка Б.-К. Хоміч па маці – Элеанора Станкевіч – была жонкай роднага брата Уладзіславы Францаўны Луцэвіч (жонкі Я. Купалы).

арышту, пераехала з маці ў Торунь (Польшча), дзе да пенсіі працавала ў Этнаграфічным музеі (цяпер – Этнаграфічны музей імя Марыі Знамяроўскай-Пруфэровай (Muzeum Etnograficzne im. Marii Znamierowskiej-Prüfferowej).

Дакументы Б.-К. Хоміч паступілі ў БДАМЛМ ад яе самой у 2007 годзе. Яны прадстаўлены двума падраздзеламі – дакументамі Б.-К. Хоміч (яе ўспамінамі, нататкай, абразкамі і інш., копіямі яе асабістых дакументаў, фатаграфій з сямейнага альбома і інш.) і дакументамі сям'і Баляслава Дуніна-Марцінкевіча (фотакопіямі дакументаў Баляслава і Вінцэнты Дуніных-Марцінкевічаў (дзеда і бабы), Георгія (Ежы) Дуніна-Марцінкевіча (бацькі) і інш. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 2001–2007, коп. за 1863–1949 гг.

Сёмы раздзел прадстаўлены дакументамі **Марыі Аляксандраўны Шабуні-Чапялёвай** – урача, пляменніцы Антона, Івана і Стэфана Луцкевічаў. М.А. Шабуня-Чапялёва нарадзілася 16 студзеня 1911 года ў горадзе Лібава Расійскай імперыі (цяпер – горад Ліепая, Латвія) у сям'і інжынера-чыгуначніка Алеся Шабуні і выпускніцы беластоцкага інстытута шляхетных дзяўчат Эміліі Луцкевіч. У 1916 годзе з сям'ёй пераехала ў Мінск. Скончыла Беларускі медыцынскі інстытут. У 1936 годзе была арыштавана, абвінавачана ў антысавецкай прапагандзе і асуджана на 3 гады лагероў. Пасля вызвалення працавала ўрачом у Манчагорску Мурманскай вобласці РСФСР. Пасля выхаду на пенсію ў 1973 годзе пераехала да дочкі ў Санкт-Пецярбург, удзельнічала ў мерапрыемствах беларускай дыяспары і таварыства ахвяраў сталінізма "Мемарыял". М.А. Шабуня-Чапялёва памерла 21 кастрычніка 2009 года.

Дакументы М.А. Шабуні-Чапялёвай паступілі ў БДАМЛМ ад яе дочкі Маргарыты Пяровай у 1998 годзе. У раздзеле яны прадстаўлены двума падраздзеламі – дакументамі М.А. Шабуні-Чапялёвай (яе ўспамінамі, фатаграфіямі ў групах з роднымі і інш.) і дакументамі членаў яе сям'і: С. Луцкевіча (дзядзькі), Эміліі Шабуні (дзявочае Луцкевіч) (маці) і інш. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за [1920-я] – 2001, коп. за [1870–1954] гг.

Прадмову склала
Заг. аддзела В.Ф. Шаталава
09.02.2024

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 377
ВОПІС №1
1918–2007, коп. 1863–1973

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 13.02.2024
№ 2

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ В.А. ЛАЗОЎСКАГА** | | | | |
| | **1.1. ДЗЁННІКІ В.А. ЛАЗОЎСКАГА** | | | | |
| 1 | В.А. Лазовский. "Клочья облаков. Время и идеалы". Дзённікавыя запісы, перапісаныя ў 2000 г. Ч. 1. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1949-1961 гг. | 133 | 1 | |
| 2 | В.А. Лазовский. "Клочья облаков. Время и идеалы". Дзённікавыя запісы, перапісаныя ў 2000 г. Ч. 2. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1962-1963 гг. | 108 | - | |
| 3 | В.А. Лазовский. "Клочья облаков. Время и идеалы". Дзённікавыя запісы, перапісаныя ў 2000 г. Ч. 3. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1962 г. | 82 | - | |
| | *** | | | | |
| 4 | В.А. Лазовский. "Сожжение. Книга потерь (Огонь в моей жизни)". Дзённікавыя запісы, перапісаныя ў 1999 г. Ч. 1. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1949-1961 гг. | 148 | 1 | |
| 5 | В.А. Лазовский. "Сожжение. Книга потерь (Огонь в моей жизни)". Дзённікавыя запісы, перапісаныя ў 1999 г. Ч. 2. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1961-1962 гг. | 104 | - | |
| 6 | В.А. Лазовский. "Сожжение. Книга потерь (Огонь в моей жизни)". Дзённікавыя запісы, перапісаныя ў 1999 г. Ч. 3. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1962-1963 гг. | 85 | - | |
| | *** | | | | |
| 7 | В.А. Лазовский. "Беседы о сущем". Дзённікавыя запісы і інш., перапісаныя ў 1995 г. Ч. 1. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1953-1962 гг. | 70 | 1 | |
| 8 | В.А. Лазовский. "Беседы о сущем". Дзённікавыя запісы і інш., перапісаныя ў 1995 г. Ч. 2. Аўтограф у пераплёце | коп. за 1962 г. | 75 | - | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 1-5.<br>Аўтограф і машынапіс з аўтарскай праўкай у пераплёце.<br>На Лл. 2-3 - аўтабіяграфія В.А. Лазоўскага (аўтограф) (2000) | 1993-2000 | 108 | 1 | |
| 10 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 6-8.<br>Аўтограф у пераплёце | 1993-1994 | 167 | - | |
| 11 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 9-13.<br>Аўтограф у пераплёце | 1994-1995 | 185 | - | |
| 12 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 14-17.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995 | 133 | - | |
| 13 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 18-21.<br>Аўтограф у пераплёце | 1996 | 147 | - | |
| 14 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 22-26.<br>Аўтограф у пераплёце | 1997 | 126 | - | |
| 15 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 27-31.<br>Аўтограф у пераплёце | 1998 | 146 | - | |
| 16 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 32-35.<br>Аўтограф у пераплёце | 1999-2000 | 128 | - | |
| 17 | В.А. Лазовский. "Свет после жизни". Дзённік. Ч. 36-38.<br>Аўтограф у пераплёце | 2000 | 191 | - | |
| | *** | | | | |
| 18 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік. Ч. 1-5.<br>Аўтограф і машынапіс з аўтарскай праўкай у пераплёце.<br>На Лл. 4-5 - аўтабіяграфія В.А. Лазоўскага (аўтограф) (2000) | 1993, 2000 | 99 | - | |
| 19 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік. Ч. 6-8.<br>Аўтограф у пераплёце | 1993-1994 | 129 | - | |
| 20 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік. | 1994-1995 | 146 | - | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ч. 9-13.<br>Аўтограф у пераплёце | | | | |
| 21 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік.<br>Ч. 14-17.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995 | 111 | - | |
| 22 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік.<br>Ч. 18-21.<br>Аўтограф у пераплёце | 1996 | 118 | - | |
| 23 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік.<br>Ч. 22-26.<br>Аўтограф у пераплёце | 1997 | 115 | - | |
| 24 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік.<br>Ч. 27-31.<br>Аўтограф у пераплёце | 1998 | 134 | - | |
| 25 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік.<br>Ч. 32-35.<br>Аўтограф у пераплёце | 1999 | 122 | - | |
| 26 | В.А. Лазоўскі. "Святло пасля жыцця". Дзённік.<br>Ч. 36-38.<br>Аўтограф у пераплёце | 2000 | 174 | - | |
| | **1.2. ІНТЭРВ'Ю В.А. ЛАЗОЎСКАГА І ІНШ.** | | | | |
| 27 | В.А. Лазоўскі. "Інтэрв'ю для вечнасці". Ч. 1.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995-1996 | 132 | 1 | |
| 28 | В.А. Лазоўскі. "Інтэрв'ю для вечнасці". Ч. 2.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995-1996 | 121 | - | |
| 29 | В.А. Лазоўскі. "Інтэрв'ю для вечнасці". Ч. 3.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995-1996 | 147 | - | |
| | *** | | | | |
| 30 | В.А. Лазовский. "Интервью для вечности. Современность в лицах и мыслях". Апытальнік і запісы інтэрв'ю. Ч. 1.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995-1996 | 158 | 1 | |
| 31 | В.А. Лазовский. "Интервью для вечности. Современность в лицах и мыслях". Запісы інтэрв'ю. Ч. 2.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995-1996 | 118 | - | |
| 32 | В.А. Лазовский. "Интервью для вечности. Современность в лицах и мыслях". Запісы інтэрв'ю. | 1995-1996 | 135 | - | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ч. 3.<br>Аўтограф у пераплёце | | | | |
| 33 | В.А. Лазовский. "Интервью для вечности. Современность в лицах и мыслях". Запісы інтэрв'ю. Ч. 4.<br>Аўтограф у пераплёце | 1995-1996 | 158 | - | |
| | *** | | | | |
| 34 | В.А. Лазовский. "Переходный период". Апытальнік і запісы інтэрв'ю. Ч. 1. "Старшее поколение (1905-1945)".<br>Аўтограф у пераплёце | 1997 | 124 | 1 | |
| 35 | В.А. Лазовский. "Переходный период". Запісы інтэрв'ю. Ч. 2: "Среднее поколение (1946-1959)".<br>Аўтограф у пераплёце | 1997 | 164 | - | |
| 36 | В.А. Лазовский. "Переходный период". Запісы інтэрв'ю. Ч.3: "Молодое поколение (1960-1974)".<br>Аўтограф у пераплёце | 1997 | 143 | - | |
| 37 | В.А. Лазовский. "Переходный период". Запісы інтэрв'ю. Ч. 4: "Юное поколение (1975-1989)".<br>Аўтограф у пераплёце | 1997 | 140 | - | |
| | *** | | | | |
| 38 | В.А. Лазовский. "Противостояние. Книга отношений". Апытальнік і запісы інтэрв'ю. Ч. 1-2 (узрост 50-90 гадоў).<br>Аўтограф у пераплёце | 1997-1998 | 139 | 1 | |
| 39 | В.А. Лазовский. "Противостояние. Книга отношений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 3-4 (узрост 40-50 гадоў).<br>Аўтограф у пераплёце | 1997-1998 | 140 | - | |
| 40 | В.А. Лазовский. "Противостояние. Книга отношений". Ч. 5-6 (узрост 30-40 гадоў).<br>Аўтограф у пераплёце | 1997-1998 | 201 | - | |
| 41 | В.А. Лазовский. "Противостояние. Книга отношений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 7 (узрост 25-30 гадоў).<br>Аўтограф у пераплёце | 1997-1998 | 91 | - | |
| 42 | В.А. Лазовский. "Противостояние. Книга отношений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 8-9 (узрост 10-25 гадоў). | 1997-1998 | 144 | - | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Аўтограф у пераплёце | | | | |
| | *** | | | | |
| 43 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Апытальнік і запісы інтэрв'ю. Ч.1. Аўтограф у пераплёце | 1998-1999 | 87 | 1 | |
| 44 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Запісы інтэрв'ю. Ч.2. Аўтограф у пераплёце | 1998-1999 | 86 | - | |
| 45 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Запісы інтэрв'ю. Ч.3. Аўтограф у пераплёце | 1998-1999 | 134 | - | |
| 46 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 4. Аўтограф у пераплёце | 1998-1999 | 120 | - | |
| 47 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 5. Аўтограф у пераплёце | 1998-1999 | 111 | - | |
| 48 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 6. Аўтограф у пераплёце | 1999 | 105 | - | |
| 49 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга предупреждений". Запісы інтэрв'ю. Ч. 7. Аўтограф у пераплёце | 1999 | 89 | - | |
| | *** | | | | |
| 50 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга прозрений". Апытальнік з запісамі інтэрв'ю. Дадатак 1. Аўтограф у пераплёце | 1999 | 124 | 1 | |
| 51 | В.А. Лазовский. "Какая наша жизнь. Книга прозрений". Запісы інтэрв'ю. Дадатак 2. Аўтограф у пераплёце | 1999 | 121 | - | |
| | *** | | | | |
| 52 | Фатаграфія В.А. Лазоўскага з маці, жонкай і інш. | [1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ Н.А. ЛУР'Е** | | | | |
| 53 | Н.А. Лурье. "30-е годы тогда и сейчас (воспоминания)". З дадаткамі. Машынапіс | 1994 | 99 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 54 | Н.А. Лурье. "Воспоминания". Варыянт. Са згадкамі вучонага-нейрапатолага М.Б. Краля, дыктара І. Кургана (Л. Эйдэльмана), прафесара А.І. Лур'е (бацькі), акадэмікаў М.М. Нікольскага і У.П. Перцава, В. Харужай і інш. Няпоўны тэкст. Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1994-1995 | 134 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 55 | Фатаграфіі Н.А. Лур'е, індывідуальная і ў групах з аднакласнікамі (у т.л. з Л. Эйдэльманам (І. Курганам) і інш. Фатаграфіі А.І. Лур'е (бацькі), індывідуальная і ў групе з членамі Бюро партыйнай ячэйкі Цэнтральнай партыйнай школы Мінска (у т.л. з В. Харужай) і інш. | коп. за 1923-1973 гг. | 7 | 7 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ М.М. НІКОЛЬСКАГА** | | | | |
| 56 | Н.М. Никольский. "Происхождение и история белорусской свадебной обрядности". Манаграфія. Пачатак. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1947 | 149 | 1 | |
| 57 | Н.М. Никольский. "Происхождение и история белорусской свадебной обрядности". Манаграфія. Заканчэнне. Машынапіс з аўтарскай праўкай. На Л. 149 - суправаджальнае пісьмо М.М. Нікольскага ў рэдакцыю Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1948) | 1947-1948 | 149 | 1 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ М.Ф. ПЛАВІНСКАГА** | | | | |
| 58 | М.Ф. Плавінскі "Вяртанне на Бацькаўшчыну", "Пяром і зброяй" і інш. Артыкулы пра М. Забэйду-Суміцкага і інш. Выразкі з газеты | 1984-1991 | 5 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 59 | Пісьмо М.Ф. Плавінскага М. Забэйдзе-Суміцкаму (Чэхаславакія) | 1964 | 2 | 1 | |
| 60 | Пісьмо М.Ф. Плавінскага дырэктару БДАМЛМ Г.І. Сурмач | 1990 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 61 | Паштоўкі і пісьмы М. Забэйды-Суміцкага М.Ф. Плавінскаму (Чэхаславакія). Адно пісьмо - на праграме канцэрта | 1964-1969 | 41 | 27 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | М. Забэйды-Суміцкага ў Празе (на чэшскай мове) (1960) | | | | |
| 62 | Паштоўкі і пісьмы М. Забэйды-Суміцкага М.Ф. Плавінскаму (Чэхаславакія) | 1971-1981 | 32 | 25 | |
| 63 | Пісьмо Н. Кастэцкай (сяброўкі М. Забэйды-Суміцкага) М.Ф. Плавінскаму (Чэхаславакія) | 1990 | 4 | 1 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ Ф.Ф. ТУРУКА** | | | | |
| 64 | Ф.Ф. Турук. "Белоруссия в XIX веке". Тэкст лекцыі. Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, уклейкай і ўстаўкай | [1927] | 36 | 1 | |
| 65 | Выпіскі Ф.Ф. Турука з "Беларускага календара на 1918 год", рукапісу Я.Ф. Карскага "Материалы для словаря новейших белорусских писателей" і інш. Рукапіс | [1920-я гг.] | 8 | 4/5 | |
| | *** | | | | |
| 66 | Дароўны надпіс Я.І. Хлябцэвіча Ф.Ф. Туруку на вокладцы друкаванага выдання "Благородная жертва Февральской революции 1917 г. студент Петроградского университета Владимир Иванович Хлебцевич. Его героическая смерть и литературные произведения: стихотворения, очерк "Война с немцами и ея отголоски"; научные заметки" (Сызрань, 1918) | | 46 | 1 | |
| 67 | В. Скалабан "Паплечнік Цёткі і Янкі Купалы. Да 100-годдзя з дня нараджэння Яўгена Хлябцэвіча", С. Чыгрын "Горкі і Хлябцэвіч". Артыкулы. Выразкі з газет | 1984, 1985 | 3 | 2 | |
| | **6. ДАКУМЕНТЫ Б.-К. ХОМІЧ** | | | | |
| | **6.1. ДАКУМЕНТЫ Б.-К. ХОМІЧ** | | | | |
| 68 | B.-K. Chomicz. "Wspomnienia dziecinstwa" ("Успаміны дзяцінства") (на польскай мове). Кампутарны выдрук | 2001 | 44 | 1 | |
| 69 | B.-K. Chomicz. "Okruchy wspomnien" ("Крохі ўспамінаў") (са згадкамі Я. Купалы і У.Ф. Луцэвіч) (на польскай мове). Кампутарны выдрук | 2005 | 33 | 1 | |
| 70 | B.-K. Chomicz. "Saga rodu Duninow" ("Сага роду Дуніных") (на польскай мове). | 2005 | 11 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Радаводы Дуніных-Марцінкевічаў.<br>Кампутарны выдрук, ксеракопія і фотакопія | | | | |
| 71 | B.-K. Chomicz. "Dzieje miasta" ("Гісторыя горада [Торунь]"), "Legenda o Flisaku" ("Легенда пра Плытагона") і інш. Нататка, абразкі, верш (на польскай мове).<br>Аўтограф, кампутарны выдрук | [2000-я гг.] - 2007 | 4 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 72 | Дакументы Б.-К. Хоміч (фотакопіі метрыкі аб нараджэнні, школьных табеляў і інш. (на нямецкай і польскай мовах) з запісамі за 1924-1949 гг., артыкула і нататак пра і са згадкай Б.-К. Хоміч, прысвечанага ёй верша М. Танка і інш. (на беларускай і польскай мовах) | коп. за 1931-1949 гг. | 23 | 14 | |
| 73 | Фатаграфіі Б.-К. Хоміч і яе родных па лініі Дуніных-Марцінкевічаў і Коўзанаў (копіі з сямейнага альбома).<br>Фатаграфія Б.-К. Хоміч у групе з Г.В. Запартыка, Т.В. Кабржыцкай, В.П. Рагойшам і інш. | 2007, коп. за 1863-1924 гг. | 29 | 2/53 | |
| | **6.2. ДАКУМЕНТЫ СЯМ'І Б. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА** | | | | |
| 74 | Дакументы Баляслава Дуніна-Марцінкевіча і яго жонкі Вінцэнты (дзявочае Рудкоўская) (дзеда і бабы Б.-К. Хоміч) (пасведчанні аб шляхецтве Б. і В. Дуніных-Марцінкевічаў, выпіска з метрычнай вянчальнай кнігі аб іх шлюбе і інш. з запісамі на польскай і рускай мовах).<br>Фотакопіі | коп. за 1863-1927 гг. | 29 | 18 | |
| 75 | Дакументы Георгія (Ежы) Дуніна-Марцінкевіча (сына Б. і В. Дуніных-Марцінкевічаў, бацькі Б.-К. Хоміч) (выпіска з метрычнай кнігі аб яго нараджэнні, пасведчанне аб яго шляхецтве і інш. на польскай і рускай мовах).<br>Фотакопіі.<br>На Л. 21 - біяграфія Г. Дуніна-Марцінкевіча, напісаная Б.-К. Хоміч (аўтограф) [2000-я гг.] | [2000-я гг.], коп. за 1896-1938 гг. | 21 | 14 | |
| 76 | Дакументы Яніны Віляновіч (дачкі Б. і В. Дуніных-Марцінкевічаў, цёткі Б.-К. Хоміч) і яе мужа Здзіслава Віляновіча (атэстат Адэскай Марыінскай грамадскай жаночай гімназіі на імя Я. Дунін-Марцінкевіч, пасведчанне аб залічэнні яе ў Варшаўскі ўніверсітэт і інш. на польскай і рускай мовах).<br>Фотакопіі | коп. за 1916-1940 гг. | 10 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **7. ДАКУМЕНТЫ М.А. ШАБУНІ-ЧАПЯЛЁВАЙ** | | | | |
| | **7.1. ДАКУМЕНТЫ М.А. ШАБУНІ-ЧАПЯЛЁВАЙ** | | | | |
| 77 | М.А. Шабуня-Чапялёва. "Малахітавы пярсцёнак". Успаміны пра А. Луцкевіча.<br>І. Марачкіна. "З роду Луцкевічаў". Артыкул пра М.А. Шабуню-Чапялёву.<br>Ксеракопіі газетных публікацый | 1999, 2001 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 78 | Даведка Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі аб шляхецкім паходжанні рода Луцкевічаў.<br>Ксеракопія | 1996 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 79 | Фатаграфіі М.А. Шабуні-Чапялёвай у групах з Эміліяй Шабуняй (дзявочае Луцкевіч) (маці), Янінай Каханоўскай (дзявочае Шабуня) (сястрой), Эдвардам Шабуням (братам) і інш. | 1970-2000 | 7 | 7 | |
| | **7.2. ДАКУМЕНТЫ С. ЛУЦКЕВІЧА, Э. ШАБУНІ І ІНШ.** | | | | |
| 80 | Пісьмы Ю. Вітан-Дубейкаўскай (Германія) да Э. Шабуні (маці) і іх пераклад з польскай на рускую мову, зроблены Э. Шабуняй.<br>Ксеракопіі | коп. за 1954 г. | 7 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 81 | С. Луцкевіч (дзядзька). Пейзаж. Накід.<br>Папера, каляровы аловак | [да 1934 г.] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 82 | Фатаграфіі Антона, Івана і Стэфана Луцкевічаў (дзядзькаў), Эміліі Шабуні (маці) і інш. з сямейнага альбома Яніны Каханоўскай (сястры).<br>Ксеракопіі | коп. за [1870-я - 1930-я гг.] | 9 | 2/32 | |
| 83 | Фатаграфія Стэфана Луцкевіча (дзядзькі) з неўстаноўленымі асобамі.<br>Фатаграфіі Надзеі Луцкевіч-Паўлюковай (жонкі С. Луцкевіча), Эміліі Шабуні (маці) (2) | [1920-я гг. - да 1934 г.], 1973 | 4 | 4 | |

У дадзены вопіс унесена 83 (восемдзесят тры)

спраў з № 1 па № 83 , 176 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

заг. аддзела В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў

______________ В.І. Бярэйшык

______________________

"_____"_____________20____ г.